ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# ГОМЕЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭТ



№7 (1060) | ЧАЦВЕР, 8 красавіка 2004 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

Абмеркавана на Савеце універсітэта

## ЗАДАЧЫ – НАДЗЁННЫЯ І АДКАЗНЫЯ

На яго пасяджэнні, якое адбылося 25 сакавіка ў абноўленым саставе, з падрабязнай інфармацыяй аб нарадзе рэспубліканскага Савета рэктараў вышэйшых навучальных устаноў, сустрэчы з яго членамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Лукашэнкі выступіў рэктар нашага універсітэта прафесар А.У. Рагачоў. Ён прыняў у ёй удзел і акцэнтаваў увагу членаў Савета ГДУ на самых важных праблемах, узнятых на названай сустрэчы. Так, у прыватнасці, на ёй дэталёва абмяркоўваліся пытанні рэфармавання сярэдняй школы, якое зараз практычна завершана і патрабуе сур'ёзнага аналізу. Падкрэслівалася, што да яго неабходна далучыцца і работнікам вышэйшай школы. Як адзначыў А.У. Рагачоў, на нарадзе рэктараў узнімаліся пытанні, звязаныя з пераходам вну на двухступеньчатую сістэму падрыхтоўкі спецыялістаў – бакалаўраў і магістраў. Але гэта не азначае, што трэба механічна капіраваць заходні вопыт у гэтай справе, неабходна узважана ацаніць і прыняць тое, што нам падыходзіць.

Дастатковая ўвага была ўдзелена таксама неабходнасці карэкціроўкі планаў набору ў вну абітурыентаў з улікам рэальных патрэб у кадрах для народнай гаспадаркі. Прэзідэнт адзначыў існуючую на сённяшні дзень праблему "перавытворчасці" юрыстаў, эканамістаў, урачоў і інш; у той час, як па шэрагу запатрабаваных новых тэхнічных спецыяльнасцей адчуваецца недахоп спецыялістаў. Актуальнай задачай, якая стаіць перад Міністэрствам адукацыі, з'яўляецца таксама распрацоўка сістэмы павышэння кваліфікацыі і падрыхтоўкі навукова-педагагічных кадраў для вну.

Асаблівае месца адводзіцца сёння арганізацыі ідэалагічнай работы ў вну, каб выхоўваць студэнтаў сапраўднымі грамадзянамі, патрыётамі сваёй краіны. Падкрэслівалася, што гэта вельмі важны напрамак у рабоце сярод моладзі і нельга весці работу фармальна, у духу былых часоў, а неабходна шукаць не новыя, сучасныя формы.

Абмяркоўваліся многія іншыя пытанні жыццядзейнасці вышэйшай школы, вырашэнне якіх, як адзначалася, будзе ў многім залежыць ад актыўнай, дзейснай работы рэспубліканскага Савета рэктараў. Цяпер яго ўзначальвае рэктар БДЭУ У.М. Шымаў.

## ЗА ПАРАДАК І ДЫСЦЫПЛІНУ

На Савеце па інфармацыі рэктара А.У. Рагачова абмеркавана пытанне аб задачах калектыву універсітэта па выкананні Дырэктывы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь №1 "Аб мерах па ўмацаванні грамадскай бяспекі і дысцыпліны". Як адзначыў Аляксандр Уладзіміравіч, гэты дакумент – лагічны працяг лініі кіраўніка дзяржавы па наведзенні парадку ў краіне, грамадстве, а асноўная яго мэта – узмацненне абароны жыцця і здароўя чалавека. Былі прыведзены статыстычныя дадзеныя па вобласці, Цэнтральным раёне г. Гомеля аб негатыўных з'явах і фактах у паводзінах людзей, што прыводзяць да траўматызму на вытворчасці, на дарогах, да розных захворванняў, чалавечых ахвяр. Дырэктыва нацэлвае на барацьбу з п'янствам, на ўмацаванне грамадскай бяспекі і дысцыпліны на ўсіх узроўнях. Адказныя адносіны кожнага работніка універсітэта да сваіх абавязкаў, дысцыплінаванасць павінны стаць нормай жыцця. Усім нам разам, падкрэсліў рэктар, пры падтрымцы прафсаюзных, маладзёжных арганізацый неабходна наводзіць парадак і дысцыпліну, не дапускаць праяўлення розных негатыўных з'яў: парушэння працоўнай дысцыпліны, правілаў захавання тэхнікі бяспекі і аховы працы і г.д.

## ВЫДАТНІКАЎ І ДВОЕЧНІКАЎ АМАЛЬ ПАРОЎНУ

Аб выніках зімовай экзаменацыйнай сесіі членаў Савета праінфармавала начальнік вучэбнага аддзела Н.І. Папкова. Сярэдні працэнт паспяховасці па універсітэту склаў 84,17%, на "выдатна" вытрымалі праверку на веды 16,38% студэнтаў, а 16,1% атрымалі двойкі (адпаведна 883 і 863 чал.). Толькі здавальняючыя адзнакі з'явіліся ў залікоўках 2,89% студэнтаў. Самымі падрыхтаванымі паказалі сябе будучыя біёлагі – агульны працэнт паспяховасці па факультэту склаў 91,33, горшы паказчык у юрыстаў – 73,7%. Больш за ўсё выдатнікаў сярод студэнтаў факультэта замежных моў – 25,7% (110 чал.). У перыяд з 1-га студзеня па сённяшні дзень за непаспяховасць адлічана з універсітэта 47 студэнтаў, з іх кантрактнікаў – 17.

Насустрач 100-годдзю прафсаюзнага руху Беларусі

**Зараз у нашай рэспубліцы праходзяць агляды дасягненняў прафарганізацый у справе абароны законных правоў і інтарэсаў членаў прафсаюза. Яны прысвячаюцца знамянальнай даце і актывізуюць дзейнасць самай масавай грамадскай арганізацыі.**

## УДАСТОЕНЫ ДЫПЛОМАЎ І ГРАМАТ

У сярэдзіне сакавіка ў г. Гомелі адбыўся І абласны слёт старшынь пярвічных прафсаюзных арганізацый работнікаў адукацыі і навукі. На ім абмяркоўваліся пытанні развіцця сацыяльнага партнёрства органаў кіравання адукацыі і камітэтаў прафсаюза, дзейнасць пярвічных прафарганізацый у сучасных умовах і інш. У рабоце злёту прымалі ўдзел старшыні прафкамаў нашага універсітэта: супрацоўнікаў – Г.І. Варатніцкі, студэнтаў – Н.І. Колтышава (яе выступленне асвятляла магчымасці матывацыі прафчленства ва ўмовах сацыяльнага партнёрства прафкама і адміністрацыі ГДУ).

На злёце былі падведзены вынікі абласнога агляду-конкурсу арганізацый галіновага прафсаюза, пераможцы якога ўзнагароджаны граматамі і грашовымі прэміямі ў памеры 100 тыс. руб. Сярод іх – прафсаюзныя арганізацыі нашага універсітэта. На рэспубліканскім аглядзе-конкурсе, які затым адбыўся ў сталіцы рэспублікі на базе ліцэя ГДУ, ва ўрачыстай абстаноўцы адбылося ўзнагароджанне Дыпломамі Цэнтральнага камітэта беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі лепшых пярвічных прафарганізацый усіх абласцей Беларусі. Пераможцамі рэспубліканскага конкурсу, прысвечанага 100-годдзю прафсаюзнага руху Беларусі, ад Гомельскай вобласці прызнаны прафсаюзныя арганізацыі нашага універсітэта на чале з Г.І. Варатніцкім і Н.І. Колтышавай, а таксама СШ №1 і №53 г. Гомеля. Іх старшыням уручаны Дыпломы, падарункі – наручныя гадзіннікі, а на рахунак арганізацый-пераможцаў пералічаны грашовыя прэміі ў памеры 200 тыс. руб.

## НА МІЖНАРОДНЫМ СЕМІНАРЫ

У г. Брацiславе (Славакія) адбыўся міжнародны семінар Сусветнай канфедэрацыі прафсаюзаў адукацыі. Удзел у яго рабоце прынялі прадстаўнікі 16 краін свету. Беларусь на ім прадстаўлялі старшыня ЦК прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі рэспублікі Т.І. Чобатава і член прэзідыума ЦК галіновага прафсаюза, старшыня прафкама студэнтаў нашага універсітэта Н.І. Колтышава.

Праграма семінара ўключала абмеркаванне пытання якаснай падрыхтоўкі сучасных спецыялістаў з улікам патрабаванняў Лісабонскай канвенцыі і Балонскага працэсу, што дазволіць павысіць іх канкурэнтаздольнасць як на ўнутраным, так і на знешнім рынку працы.

Удзельнікі семінара заслухалі даклад аб сістэме прафесійнай адукацыі ў Славакіі (ад школы да вну), прынялі ўдзел у шырокай дыскусіі аб мерах удасканалення адукацыі. Яны зацвердзілі пратакол, у якім намечаны шляхі далейшага развіцця якасці прафесійнай падрыхтоўкі моладзі.

Фотарэпартаж

## РАЗМЕРКАВАННЕ – ПАДЗЕЯ ХВАЛЮЮЧАЯ

Няцяжка здагадацца, якія пачуцці пераважалі ў душах пяцікурснікаў універсітэта зусім нядаўна, у час размеркавання на працу. Першае – адчуванне хуткаплыннасці часу: пяць студэнцкіх гадоў праляцелі нібы птушкі, і ад гэтага на сэрцы лёгкі смутак. Падругое, многія менавіта ў гэты момант зразумелі, што вучыцца трэба было больш старанна, каб прэтэндаваць на прэстыжнае месца працы.

860-ці маладым спецыялістам (бюджэтнай формы навучання) дае сёлета ГДУ пуцёўку ў самастойнае працоўнае жыццё. Задаволены заяўкі Міністэрства адукацыі на педагагічныя кадры. І наадварот, рынак працы сёння не гарантуе 100-працэнтнай занятасці прадстаўнікам вытворчых спецыяльнасцей, у прыватнасці, эканамістам. Такія, на жаль, рэаліі часу. Гэта – падстава для перагляду плана набору абітурыентаў у будучым па гэтым профілю.



На здымках: будуць працаваць у школах г. Гомеля, вобласці і рэспублікі выпускніцы філфака Х.Клімава, Ю.Лаўрова, К.Каратыш.



**Канстанцін Судзілоўскі (злева) заканчвае вучобу па спецыяльнасці "Прыкладная матэматыка", атрымаў накіраванне ў адну з фірм г. Гомеля; Аляксандру Сергіенку (справа) з факультэта фізічнай культуры прапанавана месца працы ў школе абласнога цэнтра.**



**Фота У. ЧЫСЦІКА.**

## З УЗНАГАРОДАЙ!

*За шматгадовую плённую вучэбную і выхаваўчую работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці загадчык кафедры эканомікі і кіравання вытворчасцю КАРПЕЙ Тамара Васільеўна, к.т.н., дацэнт кафедры ВМ і праграміравання АРЛОЎ Уладзімір Васільевіч узнагароджаны Ганаровымі граматамі універсітэта.*

***

*За шматгадовую плённую выхаваўчую работу са студэнцкай моладдзю, асабісты ўклад у стварэнне і развіццё новых творчых студэнцкіх калектываў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці дырэктар Маладзёжнага комплексу ЛЫСЯНКОЎ Аляксандр Вітальевіч узнагароджаны Ганаровай граматай універсітэта.*

Візіты

## ГОСЦІ З КЛЕРМОН-ФЕРАНА...

**У канцы сакавіка ў Франка-Беларускі інстытут кіравання пры ГДУ прыязджалі госці з французскага горада Клермон-Феран. Узначальваў дэлегацыю з шасці выкладчыкаў і 43-х студэнтаў дырэктар Прафесіяналізаванага інстытута кіравання Овернькага універсітэта Морыс Шэневуа.**

Увогуле, такія візіты на гомельскую зямлю ў азначаную ўстанову адбываюцца часта: 3-4 разы на год. Кожную вясну разам са сваімі выкладчыкамі прыязджаюць і студэнты.

Па добрай традыцыі кожны прыезд пачынаецца з вечароў сустрэч. Спачатку гаспадары арганізоўваюць яго для гасцей, а на наступны дзень – наадварот. Па словах намесніка дырэктара ФБІК Вольгі Емяльянаўны Карнеенка, амаль заўсёды мэтай прыезду гасцей становіцца правядзенне заняткаў у гомельскіх студэнтаў 3-5 курсаў. Цікава, што 3 курс займаецца разам з французскімі юнакамі і дзяўчатамі: сумесна праводзяцца дзелавыя гульні. Таксама адзначана, што замежнымі сябрамі заўсёды аказваецца тэхнічная і навукова-метадычная дапамога.

Зразумела, што для французскіх студэнтаў і выкладчыкаў арганізуюцца экскурсіі па гораду і яго выдатных мясцінах. А на гэты раз яны наведалі ААТ "Гомельдрэў".

Вядома, што паміж установамі адукацыі ажыццяўляецца цеснае супрацоўніцтва, таму ўжо шмат год гомельскія студэнты ездзяць на стажыроўку ў інстытут Клермон-Ферана. На 3-м і 5-м курсах яна праходзіць на працягу месяца, а на 4-м – чатырох месяцаў.

У маі чакаецца візіт у ГДУ выкладчыка па фінансаваму аналізу Фаб'ена Цьярда.

**Каб атрымаць больш падрабязную інфармацыю пра Франка-Беларускі інстытут кіравання, паглядзець фотаздымкі розных сустрэч, "заходзьце" на сайт Інтэрнета па адрасу: www. gsu. unibel. by.**

**Марына ДЖАЛАЯ.**

## ВІНШУЕМ!

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат філалагічнага факультэта горача віншуюць **СЕРЫКАВА Рыгора Уладзіміравіча, АНІСЬКОВУ Святлану Міхайлаўну** з кафедры беларускай мовы і **НІЧЫПОРЧЫК Алену Уладзіміраўну** з кафедры рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства з прысваеннем ім Прэзідыумам ВАКа Рэспублікі Беларусь вучонага звання дацэнта.

***Как уже сообщалось в предыдущем номере нашей газеты, ректор ГГУ доктор химических наук, профессор А.В. Рогачев провел встречи с коллективами всех факультетов университета. На них студенты задавали ему очень много вопросов, касающихся как учебного процесса, его материальной обеспеченности, так и условий их отдыха, быта и т.д.***

***Систематизировав самые значимые из вопросов, те, что звучали наиболее часто, мы публикуем ответы на них ректора, проректоров, руководителей соответствующих служб университета.***

# О ТОМ, ЧТО ВОЛНУЕТ

➤ ***Подлежат ли распределению граждане России, которые учатся на бюджетной основе?***

– Если выпускник имеет вид на жительство, то распределению он не подлежит, ему выдается справка о самостоятельном трудоустройстве.

➤ ***Возможно ли распределение студентов платной формы обучения (по их желанию)?***

– В соответствии с Положением о распределении выпускников, которые обучаются за счет средств республиканского и (или) местных бюджетов в учреждениях образования, обеспечивающих получение профессионально-технического, среднего специального и высшего образования в Республике Беларусь, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 14.10.2002 №1423, распределению подлежат только выпускники, которые обучались за счет средств бюджета.

➤ ***Сколько пар занятий в день положено студентам 1-го курса?***

➤ ***Возможно ли введение в нашем университете пятидневки?***

– В соответствии с положением высшей школы в вузе существует шестидневная рабочая неделя. Количество учебных часов в неделю не более 36 в сетке расписания и 2 часа занятий по физическому воспитанию за сеткой расписания на 1-4 курсах.

Для студентов старших курсов целесообразно один день в неделю планировать без аудиторной нагрузки для подготовки курсовых и дипломных работ.

➤ ***Сохранится ли система рейтинговых оценок и «автоматов» во время сдачи сессий? Будет ли она обязательной для всех предметов?***

– Система рейтинговых оценок и «автоматов» во время сдачи экзаменов зависит от текущей успеваемости студента в течение семестра по дисциплине, по которой сдается экзамен в сессию. Решение принимает преподаватель-экзаменатор.

➤ ***Правда ли, что пропуски будут «платными»? Правда ли, что за 20 часов пропуска студенты будут лишаться стипендии?***

– На основании приказа по университету от 05.11.03 №1155 з «О порядке вынесения дисциплинарных взысканий студентам за пропуск учебных занятий» за пропуск занятий в количестве **20 часов** в семестр деканом факультета студенту объявляется дисциплинарное взыскание в виде замечания, за пропуск **40 учебных часов** – выговор с предварительным уведомлением родителей и профкома студентов, за **60 часов** – отчисление из университета.

➤ ***Можно ли в рамках сессии по обоюдному согласию преподавателя и студентов провести один из экзаменов на несколько дней раньше, если подготовка к нему не вызывает особых трудностей, и тем самым увеличить время для подготовки к следующему, более сложному экзамену?***

– Для подготовки к экзамену по дисциплине должно быть **не менее 3-х дней** по Положению о курсовых, экзаменах и зачетах в высших учебных заведениях (пункт 10). Нарушать это положение никто не имеет право.

➤ ***Можно ли для получения красного диплома пересдать одну тройку, если остальные оценки в основном пятерки?***

– Для получения диплома с отличием студент должен иметь не менее 75% отличных оценок за весь период обучения и не более 25% – хороших. Пересдача экзамена по дисциплине учебного плана с целью повышения положительной оценки разрешается в исключительных случаях деканом факультета по согласованию с ректором или проректором по учебной работе.

➤ ***Просим предоставлять побольше возможностей, чтобы ездить на стажировку за границу (в частности, в Германию). Ведь практика речи – это самое главное.***

Студенты факультета иностранных языков.

➤ ***Можно ли будет сдать досрочно летнюю сессию в связи с тем, что необходимо ехать в Америку (контракт на работу уже есть)?***

➤ ***Разъясните, пожалуйста, вопрос о работе студентов за границей во время летних каникул. Можно ли перенести летнюю сессию в связи с этим?***

– На основании приказа Министерства образования Республики Беларусь от 22.08.04 №235-А «...декан факультета имеет право разрешать студентам, которые хорошо учатся, досрочную сдачу экзаменов при условии выполнения ими практических работ и сдачи зачетов по этим дисциплинам без освобождения от текущих занятий по другим дисциплинам».

Если студент, у которого нет летней практики, по своей инициативе заключил контракт с работодателем за границей, он имеет право во время летних каникул выезжать за границу на работу, но 1 сентября должен быть на занятиях.

Если есть приглашение на стажировку, учебу, выезд для лечения студента за границу, в таком случае должен быть официальный документ на имя ректора, и он принимает решение индивидуально в отношении каждого студента.

➤ ***Почему по некоторым предметам ставят «сверхвозможные» часы, которые невозможно вместить в семестр (англ. яз. – 200 часов по специальности «Мировая экономика»)?***

– В соответствии с базовым планом специальности 1-25 01 03 «Мировая экономика», (Э 01 08 00 «Мировая экономика и международные экономические отношения»), разработанным на основании стандарта специальности и утвержденным Министерством образования Республики Беларусь 18.06.2001 №Э 008-11, иностранный язык изучается в цикле социально-гуманитарных дисциплин в объеме 432 часа (I-IV семестры – 6 часов в неделю) и в цикле специальных дисциплин спецсеминар по иностранному языку в объеме 492 часа (III-VIII семестры – 4 часа в неделю, IX семестр – 5 часов в неделю). Эти часы входят в объем учебных занятий в неделю по расписанию в соответствии с учебными планами не более 108 часов в I и II семестрах, не более 180 часов в III и IV семестрах, не более 72 часов в V-VIII семестрах, не более 60 часов в IX семестре.

➤ ***Можно ли перейти на индивидуальный план обучения в связи с учебой в немецком университете, если при этом очень хорошая успеваемость?***

– В связи с учебой или продолжительной стажировкой за границей студенты не переводятся на индивидуальный график обучения, так как он предусматривает текущий контроль знаний студентов и участие в экзаменационных сессиях.

➤ ***Какие дальнейшие перспективы специальности «Лесное хозяйство»?***

– По специальности 1-75 01 01 «Лесное хозяйство» будет осуществляться набор на дневное отделение и заочный факультет, создаваться материальная база для обеспечения учебных занятий по специальным дисциплинам и проведения практик, приобретаться соответствующая учебная литература в библиотеку университета.

➤ ***Предполагаются ли изменения в условиях обучения на платной основе и перевода на бесплатное?***

➤ ***Как теперь будет осуществляться перевод студентов-платников на бюджетную основу?***

➤ ***Почему раньше переводили на бесплатное отделение после двух сессий, а сейчас после трех?***

– На основании «Инструкции о порядке перевода, восстановлении и отчислении студентов высших учебных заведений», утвержденной приказом Министра образования Республики Беларусь от 1 июля 1994 года №192 (с изменениями и дополнениями, внесенными приказом от 14 марта 1997 года №146), а также «Положения о платном обучении в Учреждении образования «Гомельский государственный университет имени Франциска Скорины», рассмотренного и одобренного решением Совета университета 30 мая 2002 г. (с изменениями и дополнениями от 5 сентября 2002 г. и 30 октября и 29 декабря 2003 г.), возможен перевод обучающихся на платной основе на бюджетное финансирование по итогам трех экзаменационных сессий:

– отлично успевающих студентов, которые достигли высоких показателей в учебно-познавательной и научно-исследовательской работе, без наличия вакантных мест;

– студентов, которые имеют по результатам экзаменационных сессий хорошие и отличные оценки, при наличии вакантных мест по специальности.

➤ ***Расскажите о перепоступлении с платной на бюджетную основу.***

➤ ***Я учусь на платной основе. В этом году хочу попытаться перепоступить. Но если мне это не удастся, смогу ли я продолжить обучение на втором курсе?***

– Студент, обучающийся на платной основе, имеет право поступать на общих основаниях, то есть участвовать в конкурсе, на бюджетную форму обучения. При этом он пишет заявление с просьбой об отчислении его из числа студентов по данной причине. Если студент проходит по конкурсу на бюджетную форму обучения, то он зачисляется на первый курс, а затем переводится на свой курс, как выполнивший учебный план. Если студент не проходит по конкурсу на бюджетную форму обучения, то он восстанавливается в число студентов на свой курс на платной основе.

➤ ***Если студент, обучающийся на бюджетной основе, сдает сессию ниже определенного балла, то он переводится на платное обучение?***

– Если студент, обучающийся за счет бюджетного финансирования, отчислен из университета за академическую неуспеваемость, то он имеет право обратиться к ректору с просьбой о восстановлении его в число студентов, но уже на платную форму обучения. Переводы студентов из-за плохой успеваемости с бюджетной формы обучения на платную у нас в университете не практикуются.

➤ ***Можно ли студентам, обучающимся по контракту, получить материальную помощь?***

– Студенту университета, обучающемуся на платной основе, в связи со сложившимися обстоятельствами, ухудшившими материальное положение семьи, может быть оказана материальная помощь по личному заявлению и ходатайству декана факультета из средств материального поощрения по внебюджетной деятельности университета.

➤ ***Почему контрактникам не платят «чернобыльские»?***

➤ ***Почему студенты из «чистой» зоны не получают стипендии, если не сдают сессию без пересдачи, ведь «чернобыльцы» после пересдач получают социальную стипендию и «чернобыльские»?***

– Повышенная на 50% стипендия выплачивается только тем студентам, которые до поступления на учебу постоянно проживали на загрязненной территории, и пользуются льготами в соответствии со статьями 18,19,20, 23,24,25 Закона Республики Беларусь «О социальной защите граждан, пострадавших от катастрофы на Чернобыльской АЭС». На указанную льготу имеют право только студенты, которым назначена стипендия.

➤ ***Я – студентка, учусь на платной основе, но у меня в семье нет матери. Вернут ли льготы об оплате за учебу неполноценной семье?***

– На основании «Положения о платном обучении в Учреждении образования «Гомельский государственный университет имени Франциска Скорины», рассмотренного и одобренного решением Совета университета 30 мая 2002 г. (с изменениями от 5 сентября 2002 г., 30 октября и 29 декабря 2003 г.), большая категория студентов, имеющих малообеспеченные семьи, имеет возможность получить льготу по оплате за обучение. Скидки предоставляются на основании документов, подтверждающих право на получение льгот. Размер скидки устанавливается в пределах размера рентабельности по конкретной специальности.

➤ ***Правда ли, что плата за обучение в следующем учебном году повысится до 850 у.е.?***

➤ ***Почему оплата за обучение в нашем университете осуществляется заранее за следующий семестр, и до сессии в случае неуплаты студенты не допускаются?***

– Плата за обучение рассчитывается в каждом учебном году в размере экономически обоснованных затрат и уровня рентабельности, необходимых для подготовки специалистов по данной специальности, и с учетом спроса на получение образования по конкретной специальности. Плата за обучение вносится два раза в год по срокам, установленным договором на платное обучение. Студент, не внесший плату за обучение в сроки, установленные договором, может быть отчислен из университета без предварительного предупреждения, как не выполнивший условия договора.

➤ ***Почему не платят социальную стипендию тем, у кого нет чернобыльской справки?***

– Социальная стипендия назначается отдельным категориям студентов, имеющим средний балл успеваемости ниже установленного для получения учебной стипендии, в том числе имеющим льготы в соответствии со статьями 18,19,20,23,24,25 Закона Республики Беларусь «О социальной защите граждан, пострадавших от катастрофы на Чернобыльской АЭС».

➤ ***Почему стипендия студента факультета иностранных языков очень отличается от стипендии на остальных факультетах, и не в лучшую сторону?***

– Размеры стипендии устанавливаются на основании «Инструкции о порядке назначения и выплаты стипендии студентам высших учебных заведений», утвержденной постановлением Министерства финансов, Министерства труда и Министерства образования Республики Беларусь 23.03.2001г. №33/27/18, в которой для гуманитарных, педагогических и экономических специальностей установлен повышающий коэффициент к минимальной учебной стипендии несколько ниже, чем для естественно-технических специальностей. Размеры же именной, персональ-

# СТУДЕНТОВ

ной, минимальной учебной и социальной стипендии для всех специальностей одинаковы. Кроме того, студентам, успевающим на «4» и «5» (по 4-балльной системе), могут быть установлены надбавки к стипендии в размерах от 20 до 50 %, которые на разных факультетах дифференцируются в зависимости от имеющего фонда надбавок.

➤ ***Что намерена сделать администрация университета, чтобы увеличить квоту для доступа в Интернет?***

➤ ***Для успешного изучения английского языка необходима лингафонная лаборатория, видеоаппаратура. Что будет сделано в этом отношении?***

– В нынешних нелегких экономических условиях ректорат будет делать все возможное для того, чтобы обеспечить учебный процесс современным техническим оборудованием.

➤ ***Оплачивается ли практика студентов, если она проходит за пределами г. Гомеля?***

– Да, оплачивается проезд в оба конца и суточные расходы.

➤ ***Можно ли перенести студенту летнюю производственную практику на весну или осень. Кто конкретно решает вопрос о переносе: деканат или ректор?***

– Нет. Мы работаем по учебным планам, установленным Министерством образования Республики Беларусь. Учебный план – закон для преподавателя.

➤ ***Почему в университете студентам, которые выезжают в другие города для участия в научных конференциях, не оплачивается дорога и командировочные расходы?***

– Бюджетным финансированием не предусмотрена такая оплата.

➤ ***Будет ли открыта в университете военная кафедра?***

– Такой необходимости у нас пока нет.

➤ ***Занятия проходят в разных корпусах – 5-м и 1-м. За 10 минут нет возможности перейти с 5-го корпуса (при этом взять одежду (очередь 120 человек) в 1-й корпус, где нужно сдать ее и при этом прийти вовремя на занятия?***

– Это бывает очень редко. Проведение учебных занятий в основном планируется в одном корпусе.

➤ ***Планируется ли оборудовать в стенах университета специальные места для курения?***

– Нет. Курение в учебных корпусах, общежитиях, других зданиях, расположенных на территории ГГУ, строго запрещено как для студентов, так преподавателей и сотрудников.

➤ ***Когда будет произведен ремонт стадиона? Будут ли модернизированы раздевалки?***

– Проектно-сметная документация на реконструкцию стадиона после экспертизы находится на доработке. I этап – реконструкция беговой дорожки, II этап – модернизация раздевалок (2004 г.).

➤ ***У нас очень мало времени (20 минут), чтобы пообедать. Что можно сделать, чтобы улучшить ситуацию?***

– Предложено внести изменения в расписание учебных занятий для обсуждения на факультетах с участием профкома студентов.

➤ ***Желательно, чтобы на этажах были зеркала и урны для мусора. В некоторых аудиториях необходимо заменить доски.***

– Отделу материально-технического снабжения дано распоряжение на их приобретение.

➤ ***Дорожка возле скверика (рядом с корпусом №2) – в ужасном состоянии, а ведь по ней ежедневно проходят тысячи студентов...***

– Под ней проходит теплотрасса, которая находится в ведении областных тепловых сетей. После проведения ими ремонта трассы, дорожка пришла в такое состояние. Данная организация поставлена в известность о необходимости ремонта дорожки.

➤ ***Планируется ли в корпусе №4 открытие еще одного компьютерного класса?***

➤ ***В некоторых аудиториях корпуса №4 доски находятся в плохом состоянии.***

– Вопрос об открытии в корпусе №4 компьютерного класса пока на повестке дня не стоит.

Доски будут заменены на основании заявок от деканатов экономического и геолого-географического факультетов.

➤ ***Почему в общежитиях запрещено посещение, кроме близких родственников?***

– В связи с участившимися случаями хищения материальных ценностей и личных вещей студентов.

➤ ***Прокомментируйте, пожалуйста, ситуацию с электропроводкой в общежитиях. Почему единственный выход из этой сложной ситуации – ограничение использования электроприборов, включая фен, утюг (без которого просто невозможно обойтись в быту). Между тем во многих комнатах есть компьютеры. Дело в проводке или в оплате?***

– Согласно Правил пожарной безопасности ППБ 2.13-2002 п. 82.1 и последнего приказа ректора университета № 208 к-з от 1.03.04 г. п. 4.3 не допускается эксплуатация в общежитиях временных печей всех типов, электронагревательных приборов, запрещено пользование электронагревательными приборами (электрокалориферами, электрочайниками, кипятильниками, электроплитками и т.д.) в общежитиях и административных зданиях.

Из-за большого количества одновременно включенных бытовых приборов электросети общежитий зачастую бывают перегружены, что приводит, в лучшем случае к автоматическому отключению нескольких комнат и неудобству проживающих, а в худшем, к возгоранию электропроводки. Что касается электрощипцов (плойки), фенов, пользоваться ими можно. Но не следует забывать, что розетка рассчитана на одну вилку и туда не следует подключать одновременно и холодильник, и компьютер, и телевизор, и другие электроприборы. Для использования утюгов будет выделено отдельное помещение.

Помня о своих правах, не надо забывать и об обязанностях. В настоящее время по всей Республике Беларусь внедряется программа энергосбережения: каждой организации доводится целевой показатель экономии энергоресурсов. Наш вуз не является исключением. Основой экономии тепла и электроэнергии является наша личная дисциплина: необходимо отключать ненужные электроприборы, электроплиты после приготовления пищи, выключать ненужный свет, своевременно оклеивать окна и т.д.

➤ ***Почему цена билетов на студенческие культурные мероприятия в ГГУ выше, чем в других вузах г. Гомеля?***

– Молодежный комплекс ГГУ частично перешел на рыночные отношения. Часть расходов (отопление, электроэнергия, водоснабжение, заработная плата специалистов, налоги, частично приобретение аппаратуры, реквизита и их ремонт, приобретение призов, канцелярских принадлежностей, для изготовления афиш и плакатов) он взял на себя. Но сохранил, в отличие от Дворцов культуры государственной структуры, бесплатные занятия во всех коллективах художественной самодеятельности. Кроме того, все участники самодеятельности имеют право бесплатного прохода на дискотеку, для наиболее активных и талантливых участников выдаются пригласительные билеты на все мероприятия, проводимые студенческим клубом (5-6 шт. на коллектив). Дети-сироты (по единому билету) проходят на дискотеку бесплатно. Цена билета рассчитывается планово-финансовым отделом и утверждается Министерством образования с учетом вышеперечисленных расходов плюс рентабельность.

При бригадной форме работы (т.е. договора-подряда) выполняется еще и немаловажная государственно-социальная задача по созданию дополнительных рабочих мест и повышению жизненного уровня студентов и сотрудников, работающих в этой сфере.

➤ ***Почему библиотеки университета не обеспечивают студентов необходимой литературой? Для подготовки ко многим занятиям студенты вынуждены обращаться в библиотеки г. Гомеля, а это довольно проблематично для тех, кто учится во вторую смену и не имеет свободного времени.***

➤ ***Обеспечат ли нас недостающей литературой по историческим и юридическим дисциплинам, для специальности «История и английский язык»?***

➤ ***Почему в библиотеках не хватает методической литературы и книг?***

– Все проблемы сегодня – в недостаточном выделении денежных ассигнований на приобретение необходимой научной, учебной литературы, а также на оформление подписки на российские и белорусские периодические издания.

80% дисциплин на историческом факультете обеспечены учебной литературой в соответствии с нормами 1:5 (0,2) на дневном отделении, заочники получают 1 комплект каждый. Требуется переиздание учебников по истории древнего мира (Восток, Греция, Рим), обновление литературы по всемирной истории нового времени, мировой художественной культуре, археологии, этнографии Беларуси и др.

Студенты факультета иностранных языков обеспечены в пределах нормы учебниками по общенаучным дисциплинам, книгами по практике устной и письменной речи, практической грамматике. В распоряжении всех студентов ГГУ – фонд оригинальной иностранной литературы (80 тыс. экз.).

Библиотеке необходимо приобрести литературу по теоретическим курсам английского языка (история языка, теоретическая фонетика, стилистика, лексикология).

За последние годы (2002-2003) студенты юрфака были полностью обеспечены учебной литературой в соответствии с нормами, т.е. 0,2, а по некоторым дисциплинам –1:1. Но, в связи с почти ежегодным увеличением количества студентов (ИПК, перевод из Мозырского негосударственного вуза) обеспеченность уменьшается. Из-за финансовых трудностей очень мало закупается научной, научно-популярной литературы для написания рефератов, контрольных, курсовых и дипломных работ.

Учебно-методическая литература разрабатывается учеными кафедр университета. Она должна обновляться каждые 3-4 года. А сказать по этому вопросу можно только то, что эта работа требует внимания, рассмотрения.

➤ ***Физкультура у нас проходит на улице, даже и в зимнее время. Когда мы сможем заниматься в помещении (в спортзале)?***

– В строй введен новый спортивный комплекс по ул. Песина, 70, что даст возможность при укомплектовании его необходимым спортивным инвентарем, мебелью снять многие проблемы, которые возникали ранее с проведением занятий по физкультуре.

➤ ***Очень неудобно, что буфеты работают только до 16.00, когда мы учимся до 19.00.***

➤ ***Хотелось бы, чтобы в буфетах был более широкий ассортимент.***

➤ ***Почему завышены цены в студенческих буфетах?***

– В тех корпусах, где студенты обучаются в две смены (корп. №№ 1,2,5), буфеты теперь работают до 19.00. Введены ставки еще одной буфетчицы и режим работы изменен согласно пожеланию студентов. Возможности расширить ассортимент блюд тоже есть.

Цены на питание студентов не завышены: столовые всех вузов г. Гомеля работают по единому постановлению облисполкома: торговая надбавка составляет 10% и наценка 30%. Продукты закупаются, минуя оптовое звено, напрямую у поставщиков.

Ваша здароўе

## ЛЯЧЫЦЕСЯ І АДПАЧЫВАЙЦЕ

**Камісіяй па аздараўленню і санаторна-курортнаму лячэнню атрыманы БЯСПЛАТНЫЯ пуцёўкі на II квартал 2004 года для студэнтаў і аспірантаў дзённай формы навучання, якія маюць ільготы па адпаведных артыкулах Закона "Аб сацыяльнай абароне грамадзян, якія пацярпелі ад катастрофы на ЧАЭС" (студэнты да 18 гадоў, бацькі з дзецьмі ад 3-х да 6-ці гадоў, пражываючыя ў забруджанай зоне, арт. 18, 23,24, 25):**

Санаторый **"Сонечны"** (Чонкі) – **з 10.04 па 30.04** – 1 шт. (захворванні органаў кровазвароту, нервовай сістэмы).

**"Прыдняпроўскі"** (г. Рагачоў) – **з 28.04 па 18.05** – 1 шт., **з 1.05 па 21.05** – 1 шт., **з 30. 06 па 20.07** – 3 шт. (захворванні касцёва-мышачнай і нервовай сістэм, гінекалагічныя захворванні).

**"Залатыя пяскі"** (Гомельскі р-н, п. Новая Гута) – **з 16.06 па 6.07** – 2 шт. (захворванні органаў дыхання, стрававання, сардэчна-сасудзістай, нервовай сістэм, апорна-рухальнага апарату, гінекалагічныя захворванні).

**"Пралеска"** (Мінскі р-н, Ждановічы) – **з 20.06 па 10.07** – 3 шт. (захворвані органаў стрававання, верхніх дыхальных шляхоў, апорна-рухальнага апарату, органаў дыхання, сардэчна-сасудзістай і нервовай сістэм).

***

**Пуцёўкі з даплатай 10%:**

**"Юнацтва"** (Мінскі р-н) – **з 16.04 па 5.05** – 2 шт. (захворвані сардэчна-сасудзістай, нервовай сістэм, апорна-рухальнага апарату) – 49 280 руб.

**"Энергетык"** (Гродзенская вобл.) – **з 22.04 па 12.05** – 2 шт. (захворвані сардэчна-сасудзістай, нервовай сістэм, апорна-рухальнага апарату) – 45 570 руб.

**"Імя Леніна"** (г. Бабруйск) – **з 23.04 па 13.05** – 2 шт. (захворвані органаў стрававання, нервовай сістэмы, апорна-рухальнага апарату) – 41 010 руб.

**"Прыдняпроўскі"** (г. Рагачоў) – **з 8.05 па 28.05** – 2 шт. (захворванні касцёва-мышачнай і нервовай сістэм, гінекалагічныя захворванні) – 47 320 руб.

**"Бярэсце"** (г. Брэст) – **з 4.05 па 24.05** – 3 шт. (захворваніі сардэчна-сасудзістай, нервовай сістэм, апорна-рухальнага апарату, органаў дыхання, гінекалагічныя захворванні).

**"Васільеўка"** (Гомельскі р-н) – **з 19.05 па 8.06** – 10 шт. (захворвані сістэмы органаў кровазвароту) – 40 590 руб.

**"Буг"** (Брэсцкая вобл.) – **з 19.05 па 8.06** – 2 шт. (захворванні органаў кровазвароту, дыхання) – 51 075 руб.

**"Прыазёрны"** (Нарач) – **з 19.06 па 9.07** – 2 шт. (захворванні сардэчна-сасудзістай, нервовай сістэм) – 51 360 руб.

**"Сонечны"** (Чонкі) – **з 25.06 па 15.07** – 2 шт. (захворванні органаў кровазвароту, нервовай сістэмы) – 42 330 руб.

**"Сасновы бор"** (Мінская вобл., г.п. Радашковічы) – **з 27.06 па 17.07** – 1шт. (захворванні сістэмы кровазвароту, органаў стрававання, перыферычнай нервовай сістэмы, захворванні жаночых тазавых органаў) – 43 600 руб.

**Па ўзгадненню з дэканатам на час дзеяння пуцёўкі студэнт вызваляецца ад вучэбных заняткаў; магчыма датэрміновая здача некалькіх экзаменаў і залікаў.**

**Звяртацца ў прафкам студэнтаў (к. 4, п. 1-19, тэл.: 57-16-11).**

Ваш досуг

## СМОТРИТЕ В КИНОТЕАТРЕ «ЮБИЛЕЙНЫЙ»

**8-11 апреля**: фантастика, приключения **«Дети шпионов-3Д. Игра окончена»** (США) 2 серии. Начало – 14.00, 17.00, 19.00. Цена билета: 1500 р.

**14-18 апреля: комедия «Невезучие-2»** (Франция). Начало – 17.00, 19.00.

**21-25 апреля: комедия «Студенческие каникулы»** (США). Начало – 17.00.

Приключения, мелодрама **«Перекрестки»** (США). Начало – 19.00.

**28 апреля-2 мая**: фантастика, комедия **«Чумовая пятница»** (США). Начало – 17.00, 19.00.

Цена билетов: 1000 р.

КИНОСЕАНСЫ ДЛЯ ДЕТЕЙ

**10-11 апреля**: приключения **«Вовочка»** (Россия). Начало – 12.00.

**17-18 апреля**: фантастика, приключения **«Атлантида: Затерянный мир»** (США). Начало – 14.00.

**24-25 апреля**: сказка **«Садко»** (Мосфильм). Начало – 14.00.

Цена билета: для детей – 300 руб., для взрослых – 600 руб.

**Молодежная дискотека (каждую субботу). Начало – 19.30.**

**Автоответчик: 57-56-69.**

***

**В актовом зале ГГУ:**

**15 апреля**: «Дни математического факультета».

**29 апреля**: «Дни историка».

Конкурс «Містэр універсітэта»

# ГАНАРОВЫ ТЫТУЛ У ЮРЫСТАЎ – УЖО 5 РАЗ!



***З 1990 года ў ГДУ імя Ф. Скарыны існуе выдатная традыцыя: кожны год выбіраць з мужчынскага складу студэнцтва найлепшага – “Містэра універсітэта”. Пакуль астатнія ўстановы адукацыі ды ўсялякія там мадэльныя агенцтвы па стандартах вышукваюць дзяўчат-прыгажунь, прыдзірліва разглядваючы іх знешнія дадзеныя, наш студэнцкі клуб вось ужо ў 14 раз ідзе па іншаму шляху, даючы мажлівасць вызначыць самага класнага... хлопца.***

Спачатку крыху статыстыкі. За папярэднія гады найбольш часта дадзены конкурс выйгравалі будучыя юрысты – ажно 4 разы (у тым ліку 2 з іх як гісторыкі-юрысты). Двойчы запальваліся зоркі прадстаўнікоў фізічнага, матэматычнага і эканамічнага факультэтаў. Таксама сярод пераможцаў адзначаліся геолаг, фізкультурнік і нават філолаг. Чаму нават? Таму што філфак – гэта, як вядома, самы жаночы факультэт. Там ёсць групы, у якіх днём з агнём не знойдзеш наогул аніводнага хлопца, а не тое, што Містэра. Затое дзяўчат, прыгожых і таленавітых, на факультэце вельмі шмат. Шэсць з іх як раз і станчылі для хлопцаў, і не толькі для іх, свой непаўторны “Мулен Руж”.

На гэты раз паспрачацца за ганаровае званне “самага-самага” дэлегіравалі сваіх прадстаўнікоў 7 факультэтаў: гістарычны – Уладзіміра Лукоўскага, эканамічны – Сяргея Бандарэнку, біялагічны – Аляксея Кругляка, юрыдычны – Юрыя Кліменку, фізічнага выхавання – Максіма Бажкова, замежных моў – Сяргея Антоненку, фізічны – Вадзіма Ермакова. Вядучыя праграмы (а імі былі Кацярына Скоблік і Яраслаў Бычкоўскі) адразу ж “загрузілі” хлопцаў выпрабаваннямі. Першым быў “літаратурны” конкурс. Як відавочна з самой назвы, удзельнікам было прапанавана бліснуць сваімі паэтычнымі альбо празаічнымі здольнасцямі і скласці за 8 хвілін творы на тэму “Як я стаў знакамітым”. Адразу скажу, што бліснуць нікому з іх не ўдалося, аднак для нефілолагаў і такі ўзровень па сутнасці – значнае дасягненне. У прыватнасці, фізік В. Ермакоў наблізіўся да лірыкі, ды нават склаў верш. Улічваючы ўсё гэта, суддзі к.ф.н., дацэнт кафедры рускай літаратуры Н.У. Суслава і выкладчыца той жа кафедры Н.А. Драбышэўская былі літасцівыя і паставіліся да ўдзельнікаў з сімпатыяй, адзначыўшы, што хлопцы стараліся.

У другім туры спаборніцтваў канкурсанты воляй арганізатараў ператварыліся ў візажыстаў і рабілі “make up” сваім партнёршам. Плады працы пачынаючых майстроў былі прадстаўлены на суд журы ў складзе касметолага міжнароднай кампаніі “Marry Kay” Святланы Кудраўцавай і пераможцы праекта “Мая краіна”па Гомельскай вобласці Крысціны Пяршко, а таксама гледачоў. Апошнім асабліва спадабаліся “Вясенняя дзёрзкасць” М. Бажкова, якую ў народзе празвалі “Бэтман”, і мадэль А. Кругляка “Раскаванасць”. Судзейская калегія ж адзначыла, як лепшую, працу Ул. Лукоўскага з адваротнай назвай “Скаванасць”.

Сапраўдны “Містэр” павінен не толькі валодаць красамоўствам і мастацтвам “make up”, але і быць модным ды стыльным. Свой густ прэтэндэнты маглі амаль у поўнай меры прадэманстраваць у трэцім конкурсе – гаспадарчым, які судзілі член Саюза дызайнераў рэспублікі Валянціна Шапавалава і дырэктар рэкламнага агенцтва “Д-3 фармат” Канстанцін Лісоўскі. Яны прызналі самым арыгінальным Юрыя Кліменку.

У якасці хатняга задання ўдзельнікі рыхтавалі тэатральны конкурс – “Басенки по басенке”. Уразіў незвычайным пярфомансам В. Ермакоў. Яго выступленне было надзвычай глыбокім і цікавым. Прыемна здзівіў прадстаўнік факультэта фізічнага выхавання М.Бажкоў. Яго байка “Воўк і ягня” спадабалася сваім жыццесцвярджальным пафасам і верай у справядлівасць. Шкада толькі, што Максім не надта далёка адышоў ад сэнсу “кананічнага” крылоўскага тэксту. Суддзі тура рэжысёр, выкладчык акцёрскага майстэрства Вольга Сакалова і выкладчык тэатральных дысцыплін СШ №61 Галіна Корзун аддалі перамогу С. Бандарэнку.

Самым вясёлым і жывым атрымаўся апошні конкурс – “Музычны”. У ім усе ўдзельнікі разам з партнёршамі спявалі дуэтам вядомыя песні расійскай эстрады. І калі хлопцы былі “глухаватыя” ды не траплялі ў ноты, то некаторыя дзяўчаты, наадварот, прадэманстравалі неблагія вакальныя дадзеныя. На мой погляд, у конкурсе перамагла зала, якая з лёгкасцю падхоплівала мелодыі. Ну, а журы (Марына Лавянецкая – выкладчык вакалу СШ №61, Анатоль Шаўцоў – кіраўнік музычнай студыі, Вячаслаў Папруга – генеральны прадзюсер цэнтра “Respect Music”) аб'явіла пераможцам дуэт А. Кругляка.

У паўзах паміж турамі, калі ўдзельнікі рыхтаваліся да выступленняў, гледачоў забаўлялі групы “Твае крылы”, “ПіПапалам”, а таксама танцоры, лаўрэаты “Першакурсніка” гэтага года Інга Кулыба і Аляксандр Сцяпанаў.



*Містэр універсітэта-2004 г. – Юрый Кліменка.*

Па выніках усяго конкурсу прыз сімпатый гледачоў дастаўся гісторыку Ул. Лукоўскаму. Віцэ-містэрам быў аб'яўлены біёлаг А. Кругляк. А званне “Містэра універсітэта” ужо ў 5-ты раз адышло юрыстам, а менавіта – Юрыю Кліменку. Ён атрымаў у падарунак ад рэктарата універсітэта офіснае крэсла. Таксама правядзенне гэтага конкурсу стала магчымым дзякуючы фінансавай падтрымцы прафкама студэнтаў.

**Наталля СТАРЧАНКА, студэнтка гр. БЖ-32 філалагічнага факультэта.**

**Фота У. ЧЫСЦІКА.**

СПОРТ

# СПАБОРНІЧАЛІ ГІМНАСТЫ

У спортзале №3 універсітэта праведзены традыцыйныя штогадовыя спаборніцтвы па спартыўнай гімнастыцы на першынство факультэта фізічнай культуры. Іх правялі ст. выкладчык кафедры спартыўных дысцыплін А.І. Кулікоў і выкладчык гэтай жа кафедры А.А. Курака.

Спаборніцтвы адкрыў і звярнуўся да іх удзельнікаў з пажаданнямі поспехаў, дэманстрацыі высокага спартыўнага майстэрства ў гэтым цікавым і відовішчным відзе спорту дэкан факультэта фізічнай культуры Г.І. Нарскін.

Мерапрыемства з'явілася выніковым у падрыхтоўцы будучых спецыялістаў па раздзелу “гімнастыка”. Пераможцамі ў юнакоў сталі студэнты 4 курса М. Балкоўскі (1-е месца), В. Ціцюк (2-е месца) і В. Баўтрэль (3-е месца). Лепшымі сярод дзяўчат былі адпаведна Ю. Кавалёва, Я. Грамовіч, І. Вярэніч. Усе яны ўзнагароджаны граматамі і дыпломамі.

Спаборніцтвы прайшлі на высокім узроўні, суддзейства ажыццяўлялі кваліфікаваныя суддзі міжнароднай і нацыяльных катэгорый з СДЮШАР №4 г. Гомеля.

На жаль, спортклуб універсітэта не аказаў садзейнічанне ў правядзенні спаборніцтваў.



**На здымку: гонару узняць сцяг спаборніцтваў быў удастоены бронзавы прызёр чэмпіянату Еўропы, удзельнік сусветнай Універсіяды ў Карэі (2003 г.), неаднаразовы чэмпіён і прызёр Рэспублікі Беларусь па спартыўнай гімнастыцы студэнт гр. ФК-53 Павел Шышоў.**

**Фота У. ЧЫСЦІКА.**

# МАЦНЕЙШЫЯ – ГЕОЛАГІ І БІЁЛАГІ



У басейне УВП глухіх адбыліся спаборніцтвы па плаванню ў праграме круглагадовай універсітэцкай спартакіяды.

На дыстанцыі вольным стылем лепшым быў Мікалай Паплаўны (геолага-геаграфічны факультэт), а на дыстанцыі ўдвая карацейшай – Алена Красава (эканомфак).

Кандыдат у майстры спорту Рэспублікі Беларусь Насця Янковіч першынствавала на дарожцы 50 м брасам, а на стометроўцы перамог Стас Куроўскі (матфак).

На дыстанцыі 50 м на спіне вызначыліся Любоў Юнгкінг (юрыдычны факультэт), на 100 м – Кірыл Чыж з геолага-геаграфічнага факультэта.

У камандным заліку ў мужчын прызавая тройка выглядае так: геолага-геаграфічны (адказны за спартыўна-масавую работу – А.У. Блашкевіч), эканамічны і юрыдычны факультэты, а сярод каманд дзяўчат – біяфак (адказны У.П. Астахаў), юрфак, факультэт псіхалогіі і давузаўскай падрыхтоўкі.

# ТЭНІСІСТЫ – У ПРЫЗЁРАХ



Прайшлі камандныя спаборніцтвы па настольнаму тэнісу на першынство г. Гомеля ў праграме круглагадовай спартакіяды паміж факультэтамі вну.

Сярод жаночых каманд перамаглі студэнткі БелДУТа. На другім месцы – спартсменкі факультэта фізічнай культуры ГДУ ў складзе: А. Круглік, Ю. Кавалёвай і К. Драгун; на трэцім – каманда агульных факультэтаў у складзе Т. Юрчанка, В. Уласенка і В. Шуліко.

БелДУТ святкаваў таксама перамогу і сярод мужчынскіх каманд. Другое месца заняла зборная агульных факультэтаў ГДУ (Я. Герасімаў, А Зубараў і К. Лось). Трэцімі ў радку прызёраў былі студэнты ГДТУ імя П. Сухога.

**В. МАРЧАНКА.**




## СПЕШИТЕ В ТЕАТР

**Только для членов профсоюза в профкоме студентов есть билеты в Молодежный театр за 50% стоимости (1250, 1500 рублей).**

**22 апреля:** пьеса в 2-х действиях **“Очень простая история”.** М. Ладо. Начало спектакля – 19.00.

Обращаться в профком студентов (корп. 4, п. 1-19).


## ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ Ф.СКАРЫНЫ

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:**

- крымінальнага права і працэсу – асістэнта;
- тэорыі і гісторыі дзяржавы і права – дацэнта;
- беларускай культуры – асістэнта;
- матэматычнага аналізу – асістэнта;
- ВМ і праграміравання – асістэнта;
- вышэйшай матэматыкі – асістэнта;
- агульнай фізікі – дацэнта;
- фізіялогіі чалавека і жывёлін – прафесара.

**Тэрмін падачы заяў – не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.**

**Заявы накіроўваць на адрас: 246019, г. Гомель, вул. Савецкая, 104.**

**РЭКТАРАТ.**

Рэктарат, дэканат юрыдычнага факультэта, калектыў кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права выказваюць глыбокае спачуванне дацэнту названай кафедры **НЯМКЕВІЧУ Ігару Віктаравічу** з выпадку напаткаўшага яго гора – смерці **МАЦІ.**

***

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў кафедры псіхалогіі выказваюць глыбокае спачуванне ст. выкладчыку названай кафедры **САКАЛОВАЙ Эміліі Аляксандраўне** з выпадку напаткаўшага яе гора – смерці **МАЦІ.**

# ГАЛОЎНАЕ ХРЫСЦІЯНСКАЕ СВЯТА




***У гэтым годзе дата каталіцкай і праваслаўнай Пасхі супадае – 11 красавіка.***

Сэнс свята на працягу стагоддзяў мяняўся. Спачатку гэта было старажытнае яўрэйскае свята ў гонар першага прыплоду дамашняй скаціны. Яго адзначалі ноччу ў 14 дзень вясенняга месяца нісан. У ахвяру Богу прыносілі ягня, каб атрымаць дабраславенне. Яго крывёю мазалі касякі дзвярэй – гэта быў знак аховы.

Але асноўны сэнс Пасхі, замацаваны ў іудаізме – нацыянальнай рэлігіі яўрэяў, — святкаванне вызвалення ад егіпецкага палону. Згодна Бібліі, каб прымусіць фараона адпусціць яўрэяў, Бог навёў на Егіпет дзесяць пакаранняў, апошнім з якіх было тое, што Анёл Гасподзень прайшоў па краіне і знішчыў усіх першанцаў. Кожная ж яўрэйская сям'я павінна была забіць ягня і памазаць яго крывёю касякі дзвярэй дома. Гэта было знакам для Анёла, які праходзіў міма такіх дамоў і нікога ў іх не забіваў. Таму само слова “пасха” паходзіць ад старажытнаяўрэйскага дзеяслова “пасах” – “прайсці”, у пераносным сэнсе – “пашкадаваць”.

У хрысціянстве сэнс Пасхі пераасэнсаваны. Падобна таму, як іудзейская Пасха прысвечана выхаду яўрэяў з егіпецкага палону, хрысціянская – вызваленню Ісусам Хрыстом ўсіх людзей ад палону граху. Хрыстос святкаваў іудзейскую Пасху са сваімі вучнямі напярэдадні сваёй смерці. Ён надаў гэтаму святу новы змест і ўстанавіў галоўнае хрысціянскае таінства – прычашчэнне. Сэнс Пасхі для хрысціян ў тым, што Ісус Хрыстос, Сын Божы, прынёс сябе ў ахвяру за грахі людзей, узышоў дзеля гэтага на крыж, памёр, тым самым выратаваў людзей.

Таксама хрысціяне бачаць ў гэтым свяце ўказанне на свой далейшы лёс. Уваскрашэнне Хрыста з'яўляецца для веруючых залогам іх уваскрашэння пасля смерці і будучага вечнага жыцця.

**В. АДЗІНОЧАНКА, дацэнт кафедры беларускай культуры.**


Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК — Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246019, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 2-14. Тэл. 56-30-71. E-mail: rggu@gsu.unibel.by

Зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263.

Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на Республиканском полиграфическом унитарном предприятии "Полеспечать", г.Гомель, ул. Советская, 1. Качество печати соответствует качеству оригиналов заказчика.

РЭДАКТАР Тамара ДУБЯК

Аб'ём 1 друк. арк.

Тыраж 1.000 экз.

Заказ 4747

Падпісана да друку 06.04.2004 г.